**Стылі і тыпы маўлення**

6 "А" клас

Мэты:Спрыяць узнаўленню і паглыбленню паняцця вучняў пра тэкст, яго стылі і тыпы; выпрацоўваць уменні ўспрымаць тэкст як цэласнае выказванне, аб'яднанае тэмай, сэнсам і граматычна; суадносіць кожнае выказванне з тыповай маўленчай сітуацыяй, вызначаць стыль выразных у стылёвых адносінах тэкстаў; усведамляць залежнасць тыпу тэксту ад зместу выказвання, вызначаць тып выразных па змесце і будове тэкстаў; самастойна складаць невялікія мастацкія тэксты з элементамі апісання прадметаў

Ходурока

I. Арганізацыйнымомант.

II. Актуалізацыявывучанага.

Карткі вучням для самастойнага выканання

Устаўце прапушчаныя літары.

Ч_лавек стаі_ь за высокай тумбай і піша нешта гусіным п_ром. На ім ш_рокае _ёмнае ад_енне, як і ва ўсіх _учоных сярэднявечча. Свечка зусім аплыла і капціць. Але ён не заўважае. У ц_нтры пакоя – др_ўляны станок.Каля станка завіхаецца м_лады хлопец. Ён з намаганнем круці_ь ручку, і станок прыхо_іць у рух. Хлопец бярэ са станка вялікі аркуш то_стай паперы са свежым адбіткам тэксту і паказвае аркуш _учонаму.

За канторкай Сымон Будны - наступнік Франц_скаСкарыны ў справе друкавання кніг і пашыр_ння асветы сярод простага народа.

III. Праца па тэме занятка.



Апавяданне — гэта такі тып маўлення, у якім расказваецца пра якія-небудзь падзеі,
дзеянні, учынкі, здарэнні. Да яго можна паставіць пытанне як гэта было?
Апісанне — гэта тып маўлення, у якім пералічваюцца прыметы ці ўласцівасці якога-не-
будзь прадмета або з’явы. Да яго можна паставіць пытанне які прадмет, з’ява?
Разважанне — гэта тып маўлення, у якім выказваецца пэўная думка (тэзіс) і даецца яе
доказ ці тлумачэнне. Да яго можна паставіць пытанне ч а м у?
Стылі тэкстаў:
гутарковы
мастацкі
навуковы
публіцыстычны
афіцыйна-дзелавы

Прачытайце тэкст. Пастаўце знакі прыпынку.
У выдзеленых сказах падкрэсліце граматычную аснову. Вызначце тып і стыль.

Выглянула сонца але дробны дождж яшчэ ішоў. Сонца зайграла на мокрым лісці дуба. А над ракой і лесам вялізнай рознакаляровай дугой устала вясёлка. Там усё яшчэ грымеў гром але ўжо зусім ціха. Здавалася што ён злаваўся і пагражаў вярнуцца.

Зелянела ўсё вакол вербы кусты кветнікі. На лісці дрэў на траве блішчала раса і ў кожнай празрыстай кроплі адлюстроўвалася яскравае жнівеньскае сонца. Мільёны сонцаў зіхацелі на зямлі!

Пасярод вуліцы цурчаў ручай. Жоўтая вада з шумам і бульканнем шпарка кацілася ў бок рэчкі і пакідала шматкі бруднай пены.

Запіс сказаў на дошцы

Малюнкі прыроды

Алесь ішоў няспешна, а перад ім адзін за адным мяняліся малюнкі прыроды. Толькі што ён захапляўся высокім абрывістым берагам, але раптам дарожка пакацілася з узгорка ўніз. Хлопцу здалося,

быццам нехта разаслаў тут вялізны рознакаляровы дыван. Гэты чароўны дыван зліваўся ўдалечыні з блакітным шоўкам чэрвеньскага неба. Толькі дзе-нідзе на гэтай неабсяжнай роўнядзі віднеліся асобныя купкі беланогіх бярозак. Дрэўцы стаялі кружком, якдзяўчаты ў карагодзе.

У адным месцы дарожку перабягаў невялікі ручай, які цурчэў з-пад маладой алешыны. Вада ў ім была такая чыстая, што відаць былі круглыя гладкія каменьчыкі на дне.

V. Замацаванне.

Прачытайце пачатак трох тэкстаў. Да якога тыпу маўлення можна аднесці кожны з іх? Дакажыце.

I. Саша — мой лепшы сябар. У яго цёмныя вочы і светлыя валасы з віхрамі на патыліцы...

II. Аднойчы выйшлі мы з Сашам пагуляць. Недалёка ад вёскі ў хмызняку заўважылі маленькую бездапаможную казулю. Маці каля яе не было...

III. У мяне ёсць сябар. Гэта Саша — мой аднакласнік. Я вельмі паважаю яго. І вось чаму...

VI. Рэфлексія.